піць гарэлку і паяўляцца ў гэтых мейсцох п'яным.

**Браварок.** Надовічы акцызнікі выкрылі патайны політурны браварок у хаце селяніна вёскі Ажулоўкі (віленск. пав.) Пётры Станілевіча.

**Пажар.** У в. Колпеі, войстомск. вол., ашмянск. пав., згарэло 9 гаспадарскіх забудаваньняў з усім дабром 9 гаспадароў.

**Ваўкі.** Каля м-ка Кроні (троцк. пав.) напала 7 ваўкоў на лесьніка А. Бабянскаго. Лясьнік с перша стрэляў у ваўкоў, а пасьля ускочыў на дзерэво, дзе і прасядзеў усю ноч. Толькі на раніцу падарожные ўбачылі яго і знялі з дзерэва.

**Нашы навіны.** (З даўгіноўск. вол., вілейск. пав.). Адзін селянін вёскі Васілінак, даўгінаўскай валасьці, Казімір Красоўскі меў 800 руб. і ня ведаў гдзе іх схаваць. Сколькі ён ня думаў і ня мог прыдумаць добраго мейсца. А пасьля узяўшы гэтые грошы занёс на поле пад ветрак у каменьня і схаваў. Якраз пасьвілі пастухі на тым мейсцы жывёлу і знайшлі гэтые грошы. Адзін, пастушок быў гаспадара гэтых грошы, а другі—другога гаспадара. Пастушкі думалі што гэты грошы, як кажуць, швэдоўскіе і забралі сабе. Пасьля панёс Красоўскі дакладываць да тысячы у гэтые каменьня, аж глядзіць і гэных німа. Падняўся крык і, як даведаўся, што знаў аб іх яго пастушок, стаў біць яго да сьмерці, а пастушок той толькі знайшоў, а забраў грошы бацька другога пастушка. Справа дайшла да станавога, і станавы адабраў гэтые грошы і аддаў Красоўскаму. Цяперака, як чуваць, пастушок Красоўскаго памёр ад атрыманых ад гаспадара пабоеў, уміраець і гэты чэлавек, каторы забраў с-пад каменьня грошы; відаць і яму добра досталася палак. Вось што зрабіў нядобры схоў, вось мы, беларусы, што робім у 20 веку, калі усе народы дайшлі да такой вялікой цывілізацііl аж стыдна гаварыць. Пара апомніцца, што і нашы прадзеды, былі разумнейшые за нас. Людзі, каторые маюць грошы, закладаюць хаўрусные крамы, коопэратывы, а у нас іначэй: хто маіць—той не знаіць, што з імі рабіць: палажыць там, гдзе паперовые грошы мышы могуць зьесьці, або с саломай карова зьесьць. Адным словам, нікому не дасьць і сам не скарыстаець.

У м. Даўгінаві хутка скончуць будаваць рэмесленнае вучылішчэ на тры аддзелы: слесарнае, кавальскае і сталярнае. Добра і такое, бо усё-ж такі наш селянін можэ чагось лепшаго падвучыцца. Сколькі ні пісалі і ні стараліся, каб аткрыць гарадзкое вучылішчэ, але міністр народнай асьветы даў знаць, што у гэтым гаду не хапае грошы на открыцьцё новых гэтакіх вучылішч.

У гэтым самым мястэчку думаюць аткрыць у 1915 г. «Сельскі гаспадарскі гурток», каб рабіць на полі розные пробы са збожэм і выпісываць к вясьне для гаспадароў добрые пэўные насеньня.

*Б. Н.*

## З Міншчыны.

**Абавязывающая пастанова,** апавешчаная у Мінску. У губэрнях: Мінскай, Магілёўскай і ў паветах: Смаленскім, Краснінскім, і Парэцкім—Смаленскай губ. і Слонімскім, Кобрынскім, Пружанскім і Брэсцкім (апрача мейсцовасьцей, уходзячых у крэпасны район)—Гродзенск. губ., вартаваньне (охрана) жалезнадарожнай лініі, тэлеграфу і ўсіх збудаваньнёў, якіе знайходзяцца у паласе адмежэванай для чыгункі, ускладаецца на мейсцовае насеmenьне. Асобы, вінавачэные у нявыпоўненьні гэтай абавязываючай пастановы будуць карацца штрафам да 3000 р. або атседкай у турме ці крэпасьці да 3 месяцоў.

**Штраф.** На пражываючаго ў фальв. Стрэжаў, хойніцк. вол., рачыцк. пав., мешч. г. Мітавы, К. Леболя наложэна штрафу 3000 р. або 3 месяцы арышту за распаўсюджываньне фальшывых чутак аб вайне, выклікаючых трывогу.

**Высяленьне.** Упраўляючый двара Вірхуціно, бабруйск. пав., барон фон-Майдэн за публічную зневагу расейскай народнасьці высяляецца з Мінскай губ.

**Кара сьмерцяй.** Надовічы выпоўнена кара сьмерцяй па прыгавору мінскато ваенна-акружного суду над Л. Карпінскім, С. Хурсом, С. Булайчыкам, П. Сарновым, М. Кавальчуком і О. Глінскім якіх вінавачэна у разбойніцкім нападзе у часе мобілізаціі у Ігуменск. пав.

**Лазарэт замест шынкоўнец.** Селяне Заслаўск. вол. Мінск. пав., прыгаварылі на сходзе закрыць усё казённые і прыватные шынкоўні, а заместа іх, за згодай суседніх валасьцей, аткрыць у Заслаўі селянскі лазарэт для раненых.

**Шалёны.** У Мінску у памешчэньні службы цягі Лібава-Роменскай чыгункі прылучылося такое нешчаснае здарэньне. 23 сьнежня днём прыйшоў у гэту кантору без дай прычыны тэхнік гэтайжэ чыгункі С. Ліпніцкі і адразу звярнуў на сябе увагу сваей гутаркай не дарэчы. Пасьля зайшоў ён ад дзьвярэй і без нічога ніякаго пачаў стрэляць у людзей, што там былі. Найперш раніў цяжка інжэнера Т. Маслова і лягчэй В. Рэдзько. Тутака патскочыў да стрэляючаго чыноўнік М. Сорокін, каб вырваць аружжэ, але трыма выстрэламі Ліпніцкі палажыў яго трупам на мейсцы. Усе быўшые там людзі уцяклі. Ліпніцкі тады заваліў дзьверы мэблямі, каб ніхто ня мог улезьці. Паклікалі паліцію, каторая гадзіны дзьве не магла даць рады шалёнаму. Пасьля удалося гарадавіком прабрацца цераз вакно і абезаружыць Ліпніцкаго, ранюча яго цяжка выстрэламі. Ліпніцкі выпусьціў у гэты дзень 18 куль, якімі апрача названых асоб раніў яшчэ канторшчыка Есінова і чыноўніка М. Евлова. Ад атрыманых ран у часе перастрэлкі с паліціей Ліпніцкі памёр.

## З усіх старон.

**Аб прызыве.** Апавешчана Найвышэйшы указ аб лічбе навабранцаў сёлетняго (1915 г.) прызыву. Прыклікаецца на ваенную службу 585 тысяч. Прызыў будзе цягнуцца ад 15 студня да 15 лютаго 1915 году. Прыймаюцца у войска усе, годные к ваеннай службе і не маючые льготы, а такжэ маючые льготу чацьвёртаго, трэцяго і другога разраду і ўсе льготнікі першаго разраду з лічбы асоб жыдоўскай веры.

**Аб дармовым праездзе.** Па загаду міністэрства дарог ад 3 сьнежня 1914 г. спынено выдаваньне пасьведчэняў на дармовы праезд па чыгункам сваяком пакліканых на вайну запасных і ратнікоў для адведываньня сваіх хворых і раненых ваякоў.

**Проці кніжэк.** Чэрнігаўскі губэрнатар апратэставаў пастанову городнянскаго (чэрнігоўск. губ.) земскаго сабраньня аб арганізаціі лекцій аб вайне, а такжэ аб пашырэньні сярод населеньня і раненых, знайходзячыхся ў земскіх лазарэтах, географічных карт (мап) і даступнай для народу літэратуры, знаёмлючэй с ходам ваенных здарэньнеў.

**На Чырвоны Крыж** ад пачатку вайны да 20 сьнежня наплыло дабравольных ахвяр на суму 4,333,175 руб. 60 кап.

**На патрэбы вайны** Масква як падлічылі маскоўскіе часопісі, ахвяравала дагэтуль каля 44 мільёноў руб.

**Мільён рублёў на мэдыкамэнты** (лекарскіе прылады). Член глаўнаго упраўленьня Чырвонаго Крыжу Ордін апаведаміў глаўнае упраўленьне, што с прычыны новаго наладжываньня аддзелоў Чырвонаго Крыжа на Каўказі і заснаваньня басьніцоў у чатырох паўдзённых губэрнях, чаго даўней не спадзевалася, паўстае патрэба прыдбаць заграніцай мэдыкамэнтоў на 1 мільён рублёў. Глаўнае упраўленьне пазволіло радзе складоў закупіць патрэбные рэчы на гэту суму.

**Кара сьмерцяй** за шальмоўствы пры дастаўках у армію. Аж гэткай кары будуць аддаваць тых, што захочуць рабіць якіе шальмоўствы пры дастаўках уселякіх рэчэй патрэбных для ваюючэй арміі.

**Для манапольшчыкоў.** Рада міністроў зацвердзіла пастанову міністра фінансоў аб выдачы 1,900,000 руб. на запамогі звольненым с службы вольнанаёмным служачым пры казённай прадажы гарэлкі.

**Аб гарэлцы** У кастрычніку 1914 г. гарэлкі і спірту прададзена ва ўсей Расеі 87,186 вёдзер, на 9,756,306 вёдзер меней, чымся у кастрычніку 1913 г.; ад 1 студня да 1 лістапада 1914 г. агулам прададзена 54,061,584 вёдры, на 29,539,541 вёдзер меней, чымся за той-жэ час у 1913 г. Даход ад прадажы гарэлкі і дэнатурованаго спірту у кастрычніку 1914 г. раўняўся 1,492,109 р., або на 82,597,087 руб. меней, чымся у кастрычніку 1913 г.; агулам ад 1 студня да 1 лістапада 1914 г. гарэлка дала 465,604,716 руб., на 249,417,300 р. меней, чымся за той самы час у 1913 г. Да гэтых вылічэньнеў не далучэны рэзультаты ад прадажы гарэлкі у губэрнях захопленых вайной.

**Прадажа гарэлкі у 1915 г.** Глаўнае упраўленьне неакладных збораў і казённай прадажы гарэлкі разаслало у губэрскіе акцызные установы цыркуляр, загадываючый прыступіць к наладжэньню парадку продажы гарэлкі у даннай губэрні у 1915 г. Парадак гэты павінен быць абдуманы толькі на адзін год. Ужо пачаліся працы у гэтым напрамку, спадзеючыся, што праўдападобна продаж некаторых спіртных напіткоў аткрыіцца на пачатку лета.

**На сваей адзежы.** Глаўнае турэмнае упраўленьне. каб зьменьшыць расходы казны, пазволіло арыштантам мець сваю адзежу Адзежа гэта, бялізна і обуў павінны быць пашыты з матэр'ялу, падобнаго турэмнаму, і на турэмны манер.

**За газэту.** Аштрафована рэдактара «Веч. Вр.», Суворына, на 3000 руб. або 3 месяцы арышту за стацьцю: «Остзейцы міністэрства заграніčных спраў» і «Вялікіе спадзеваньня».

**Проці немцоў.** Петроградзкі градоначальнік паведаміў паліцію, што ў сілу загаду Верхоўнаго Глаўнакамандуючаго павінны пакінуць Петраград да 15 студня усе нямецкіе і аўстрыяцкіе падданые без ніякіх выключэньнеў—ростам ад 17 да 65 год. Тые з нямецкіх і аўстрыяцкіх падданых, каторые ня выпоўняць гэтаго загада, будуць аддадзены пад ваенна-палевы суд.—«Бирж. Вѣд.» пішуць, што па загаду ваенных ўласьцей ва ўсей расейскай дзержаві будуць спынены на ўвесь час вайны усе выдавецтвы газэт у нямецкай мові.—па загаду ваенных ўласьцей закрыта у прабалційскіх губэрнях 11 ніжэйшых школ, утрымліваных быўшымі нямецкімі таварыствамі.

**76 сьмерцей ад дэнатурованаго спірту.** С прычыны атруцьця дэнатурованым спіртам памёрла у Варшаві у сьнежні 16 людзей. Агулам за 5 апошніх месяцоў 1914 г. прыплаціла жыцьцём праз піцьцё дэнатурованого спірту 76 чэлавек.

**У Галіччыне.** Архіепіскоп Евлогій прэдставіў у сынод стасоўные матэр'ялы аб арганізаціі у Галіччыні праваслаўнай цэркві. Паміж іншым холмскі ўладыка дае раду скасаваньні у Галіччыні цэркоўнай уніяцкай ўладу, бо расейскае право не прызнае уніі, а за гэтым паручае звярнуць увагу на устройство у Галіччыне цэлаго раду цэркоўна-прыхадзкіх школ.—Гурток расейскіх націоналістоў, каб зменьшыць польскі выгляд Львова, выступіў с праектам, каб пасьля вайны усе польскіе памятнікі перэнясьці да Варшавы і Кракова, а калі гэта не ўдасца зрабіць, то да Масквы для памешчэньня іх у Крэмлі, як ваеннай здабычы.

**Пры гэтым нумэры разсылаецца усім падпісчыкам «Беларускі Календар» на 1915 год.**

## Аб усім па троху.

**Колькі усяго славяноў.** Калі цяпер, як кажуць, ідзе вайна паміж іншым за лепшую долю паднявольных народаў, прыводзімо тутака лічбы славяноў, з якіх не малая частка знайходзіцца пад такой ці сякой няволяй. Агульная лічба славян на ўсей зямлі даходзіць да 178 мільёнаў. Гэтак, Вялікаросаў 70 мільёнаў, Украінцаў—38, Палякоў — 27, Беларусоў—9, Сэрбо-Хорватаў — 12, Чэхаў — 8, Балгароў—8, Славакоў—3, Словенцаў—2 мільёны, Лужычан—200 тысяч.

## Пісьмо у Рэдакцію.

Просім Шаноўную Рэдакцію памясьціць нашу пісульку са шчырай падзякай Беларусскаму Музыкальна Драматычнаму Гуртку.

Ад душы дзякуем названы гурток за прысланые папіросы і серчыкі.

С пашанай Музыканты с перадавога перэвязачнаго пункту . . . . . . . . . пехотнаго . . . . палка.

Пісаў музыкант *Янук Міхаэль.*
Ваюючая армія, 19/XII—14 г.

Рэдактар-Выдавец
I. Луцэвіч.

Фирма удостоена на россійскихъ и заграничныхъ выставкахъ более 100 наградъ.

СѢМЕНА

огородныя, сельско-хозяйственныя, лѣсныя и цвѣточныя, самаго высш. достоинства, вѣрныхъ сортовъ и съ испытанной всхожестью, предлагаетъ въ самомъ богатѣйш. выборѣ по сам. умѣренн. цѣнамъ

Гейнрихъ Геггингеръ въ Ригѣ,

Сѣменная торговля (существуетъ съ 1851 г.).

Каталогъ высылается безплатно, а главный каталогъ со многими новостями и съ болѣе 700 рисунками высылается за 30 коп., съ наложеннымъ платежемъ 50 коп.

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.